УДК 34(091)

# РЭАРГАНІЗАЦЫЯ СІСТЭМЫ СЯЛЯНСКАГА ЗЕМЛЕКАРЫСТАННЯ ПАСЛЯ ПРЫНЯЦЦЯ УСТАВЫ НА ВАЛОКІ 1557 ГОДА

**Кожар А.В.,** ст. выкладчык
каф. «Эканоміка і права»
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

З развіццём таварна-грашовых адносін феадалы Вялікага Княства Літоўскага былі зацікаўлены в павышэнні даходаў ад сваёй гаспадаркі, але старая сістэма землекарыстання і падаткаабкладання сялян не спрыяла гэтаму. Менавіта таму шляхам разнастайных змен у сістэме землекарыстання была праведзена аграрная рэформа, якая ўвяла валочную памеру, як новую адзінку падаткаабкладання сялян.

Рэформа пачала праводзіцца ў 1551 годзе, але тэкст Уставы 1551 г. і інструкцыя мернікам да нашага часу не захаваўся. Аб іх існаванні сведчаць толькі ўскосныя сведчанні. З-за шматлікіх парушэнняў пры замерах было прынята рашэнне правесці рэвізію і для рэвізораў была распрацавана новая інструкцыя “Устава на валокі” прынятая 1 красавіка 1557 года.

Галоўнай мэтай рэарганізацыі сялянскага землекарыстання “Уставай на валокі” ставілася павелічэнне даходнасці гаспадарак феадалаў. Уся зямля, якая знаходзілася ў сялян падзялялася на валокі (21,6 га), замест састарэлага падзелу на моргі (0,71 га). Часам у валоку уключалася не 30 моргаў, а болей за кошт нязручных для абпрацоўкі ўгоддзяў. Гэтыя ўчасткі называліся “наддавкамі” і падаткамі не абкладаліся. Звычайна сяляне бралі сабе па паўвалокі, што складала прыкладна 12 га. Часам адну валоку бралі ў выкарыстанне дзве сям’і, члены якіх былі паміж сабой роднымі ці сваякамі.

У залежнасці ад павіннасцяў, якія выконвалі сяляне валокі падзяляліся на асадныя (чыншавыя) і цяглыя.Галоўнай павіннасцю з цяглай валокі была паншчына, а з асаднай грашовая выплата.

Нормы выканання павіннасцяў залежылі ад катэгорыі зямлі. Згодна з “Уставай на валокі” яна падзялялася на добрую, сярэднюю, кепскую і вельмі кепскую. Сяляне былі павінны адпрацаваць па 2 дні

на працягу 49 тыдняў з валокі зямля, а актамя гэтага за мест паншчыны ў дні рэлігійных свят адпрацаваць чатыры талакі летам.

Асадныя сяляне, як і цяглыя павінны былі выплаціць чынш, памер якога залежыў ад якасці зямлі. З добрай – 21 грош, з сярэдняй – 12, з кепскай – 8, з вельмі кепскай – 6.

Акрамя паншчыны і чынша на сялян накладаліся такія павіннасці як дзякла (прадуктамі ці грошамі), стацыя, невадоўшчына і “гвалты”.

Да дадатковых павіннасцяў, якія налагаліся на сялян адносіліся: рамонт і будоўля мастоў, пакос фальварачных сенажацяў, перавозка грузаў феадала, пільнаванне гаспадарскага двора. Служылыя сяляне (баяры-путныя) працягвалі несці прадугледжаную для іх службу. Больш дакладна “Устава на валокі” іх прававое становішча не вызначала.

“Устава на валокі” замацоўвала, што выконваць павіннасці селянін абавязан з усходу сонца і да захаду. За парушэнне выканання павіннасцяў сяляне падвяргаліся пакаранням. За першы дзень адсутнасці – штраф 1 грош, за другі дзень адсутнасці селянін павінен быў аддаць барана, а за трэці дзень селянін падвяргаўся цялеснаму пакаранню (біццё бізуном).

Пасля правядзення рэформы змяніліся органы сялянскага самакіравання. Дзясятнікі, старцы і іншыя службовыя асобы былі заменены сельскімі войтамі, якіх выбірала сельская грамада і зацвярджаў рэвізор. У кампетэнцыю склськага войта ўваходзіў кантроль выкарыстання зямель, кантроль за выкананнем паншчыны і іншых павіннасцяў, а таксама вырашэнне гаспадарчых спрэчак паміж сялянамі.

Такім чынам, зямельная рэформа XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім, якая замацавала перадзел зямлі і перабудову сельскай гаспадаркі, мела вынікам ўмацаванне дзяржаўнай і феадальнай уласнасці, канчатковае афармленне прыгонніцкіх адносін і сведчыла пра пераход эканомікі на новы ўзровень.